ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1983
13
СТУДЗЕНЯ
ЧАЦВЕР
№ 2 (1378)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"
## тэлетайп
· Учора · Сёння · Заўтра ·

### ПАСЯДЖЭННЕ КЛУБА

«Мысліцель» прайшло ў інтэрнаце № 2. Студэнты з Народнай Дэмакратычнай Рэспублікі Йемен і Гвінеі сустрэліся з былым камандзірам экіпажа ІЛ-2 Героем Савецкага Саюза Мікалаем Якаўлевічам Зайцавым. Цяжка перадаць словамі тое ўражанне, якое выклікалі ў студэнтаў успаміны М. Я. Зайцава аб гераізме савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

З. АЛЯШКЕВІЧ,
наш кар.

### ПРЫЗЁРАМ

міжнароднага турніру па класічнай барацьбе, які праходзіў у Данецку, стаў слухач падрыхтоўчага аддзялення БДУ імя У. І. Леніна Камандар Маджыдаў. Ён заняў трэцяе месца.

В. РУДЗЯНКОЎ,
старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.

### ВЕЧАР

знаёмства в'етнамскіх студэнтаў з беларускай культурай адбыўся ў БДУ імя У. І. Леніна. Тэма яго—«Творчасць беларускіх песняроў Янкі Купалы і Якуба Коласа». Вусны расказ аб жыццёвым і творчым шляху паэтаў быў дапоўнены фанаграмамі з галасамі Купалы і Коласа, песнямі на іх словы.

КІРЫМ ЦІЕН ХАЙ,
студэнт факультэта журналістыкі.

### У АГЛЯДЗЕ-КОНКУРСЕ

сярод інтэрнатаў першае месца заняў інтэрнат № 7 (старшыня студсавета Г. Русіновіч), другое — інтэрнат № 6 (старшыня студсавета І. Святаха), трэцяе — інтэрнат № 2 (старшыня студсавета Г. Пальчык).

У. АБРАМОВІЧ,
студэнт факультэта журналістыкі.



# ЦІШЭЙ, ІДЗЕ ЗАЛІК!

ФОТАРЭПАРТАЖ



УСЁ ЧАСЦЕЙ І ЧАСЦЕЙ паяўляюцца на дзвярах аўдыторый аб'явы: «Цішэй, ідзе залік!». Студэнты тоўпяцца ў чарзе. Хто знешне спакойны, хто ліхаманкава гартае канспекты ці падручнікі. Сесія... Колькі сцэн разыгрываецца ля дзвярэй, на якіх трывожна бялее аркуш з трыма кароткімі словамі. Вось нейкі хлапец рассоўвае па кішэнях «паперкі», а таварышы жартуюць: «Ну, Санька, і вялізны ж у цябе багаж ведаў! Ні пуху, ні пер'я!».

Але вось адчыняюцца дзверы — і ўсе кідаюцца да аднакурсніка з пытаннямі:

— Які білет выцягнуў?

— Дадатковыя пытанні задаюць?

А той, задаволены і ўзбуджаны, толькі і змог, што выдыхнуць:

— Зал-і-і-к!!!

Вунь дзяўчына дрыжачымі пальцамі нервова цярэбіць насоўку, на вачах слёзы. Яна ўжо не можа стрымаць іх, і цякуць яны па шчаках, змываючы туш і фарбу з твару. Адразу відаць — першакурсніца.

— Натка, чаго ты?! Усё будзе добра. Ну не плач... Ды пераздасі ты гэты залік.

— Я ж вучыла! — І затрэсліся ад плачу худзенькія плечы.

А там, за дзвярыма... Баязліва цягнецца рука да білета. Потым незадаволенае, панурае маўчанне ці з палёгкай: «о-ох!»

...Блукае па аўдыторыі позірк. Вось ён падае за халодныя шыбы вокнаў. І раптам так захочацца туды, дзе ціха падае снег і задумена стаяць дрэвы. А трэба думаць аб класіцызме і міфалогіі, кінетыцы і тэорыі адноснасці.

І ўсё ж галоўнае наперадзе. Чуеш, студэнт, як ідзе па гулкіх калідорах універсітэта яе Вялікасць СЕСІЯ?! Зусім ужо хутка ўбачыш ты на дзвярах аўдыторыі размашысты надпіс:



«Цішэй, ідзе экзамен!»

С. МАЕЎСКІ.

*НА ЗДЫМКАХ: ідзе залік па методыцы камуністычнага выхавання ў другакурснікаў біялагічнага факультэта. Прымае старшы выкладчык кафедры педагогікі Міхаіл Сямёнавіч Мяцельскі. Выдатныя веды паказала Ірына Пашук.*

*— Малайчына, выдатна! — не можа ўстрымацца ад пахвалы выкладчык.*

*Фота В. ШАЧАКА.*



НОВАЕ АДДЗЯЛЕННЕ ФГП

## Хочаш падарожнічаць? Калі ласка!

ЗАРАЗ ВЯЛІКАЯ ЎВАГА ўдзяляецца актывізацыі турысцка-экскурсійнай работы, што патрабуе падрыхтоўкі большага атрада кваліфікаваных турысцкіх кадраў. З гэтай мэтай у бягучым навучальным годзе на факультэце грамадскіх прафесій створана новае аддзяленне арганізатараў турысцка-экскурсійнай работы. Вучоба на аддзяленні праходзіць па дзвюх спецыяльнасцях.

Разам з бюро міжнароднага маладзёжнага турызму «Спутник» Мінскага АК ЛКСМБ вядзецца падрыхтоўка **экскурсаводаў** для работы на планавых турысцкіх маршрутах «Спутника», абслугоўвання экскурсійных груп школьнікаў, рабочай і студэнцкай моладзі. Вывучэнне курса асноў экскурсазнаўства цесна звязана з дысцыплінамі па гісторыі КПСС, навуковаму камунізму, педагогіцы і псіхалогіі, геаграфіі і краязнаўству, якія вывучаюцца студэнтамі універсітэта, і дае магчымасць набыць спецыяльнасць экскурсавода з выкарыстаннем багажу ведаў, назапашаных у працэсе асноўнай вучобы. Спецыяльная падрыхтоўка прадугледжвае вывучэнне такіх пытанняў, як класіфікацыя экскурсій і метадычныя прыёмы іх правядзення, дыферэнцыраваны падыход у экскурсійнай рабоце і інш.

Вялікая ўвага адводзіцца практычным заняткам на экскурсійных аб'ектах Мінска і стажыроўцы на адным з маршрутаў «Спутника». Пасля здачы заліковай экскурсіі «Мінск — горад-герой» выпускнікі аддзялення змогуць працаваць у перыяд канікулаў на планавых маршрутах «Спутника», праводзіць экскурсіі для школьнікаў у час правядзення «дзён факультэта».

Вучоба **турысцкіх арганізатараў** і старшынь турысцкіх секцый арганізавана разам з Беларускім рэспубліканскім саветам па турызму і Федэрацыяй турызму БССР. Вучэбны план прадугледжвае вывучэнне арганізацыйных і метадычных пытанняў правядзення турысцкіх падарожжаў, аднадзённых вучэбных паходаў і заліковага шасцідзённага турысцкага падарожжа. У працэсе вучобы слухачы маюць магчымасць здаць нарматывы на значок «Турыст СССР» і выканаць нарматывы III спартыўнага разраду па турызму.

Усіх, хто хоча расшырыць веды ў галіне гісторыі і культуры, прайсці турысцкімі сцяжынкамі, запрашаем на аддзяленне арганізатараў турысцка-экскурсійнай работы.

У. ПІРОЖНІК,
дэкан факультэта грамадскіх прафесій.

## ТРЫБУНА ПАРТОРГА

# І словам, і прыкладам

У ПАЧАТКУ СТАГОДДЗЯ У. І. Ленін сказаў словы, у якіх выражана сама сутнасць адносін партыі камуністаў да моладзі: «Мы — партыя будучага, а будучае належыць моладзі. Мы—партыя наватараў, а за наватарамі заўсёды ахвотней ідзе моладзь». Узяўшы гэтыя словы на ўзбраенне, партыйнае бюро ФПМ удзяляе значную ўвагу пытанням кіраўніцтва камсамольскай арганізацыяй факультэта. Гэта работа стала яшчэ больш мэтанакіраванай і эфектыўнай пасля разгледжання ў верасні 1981 года на бюро парткома БДУ імя У. І. Леніна пытання «Аб рабоце партбюро ФПМ па кіраўніцтву камсамолам».

На многіх пасяджэннях партыйнага бюро факультэта, партыйных сходах аналізаваліся розныя аспекты работы камітэта камсамола: стан прававога і ідэйнага выхавання, вынікі працоўнага семестра і задачы партарганізацыі па далейшаму ўдасканаленню працоўнага выхавання студэнтаў, стан ідэйна-палітычнага выхавання ў пазавучэбны час, ваенна-патрыятычнага і інтэрнацыянальнага выхавання, развіццё НДРС і іншыя пытанні.

18 лістапада мінулага года адбыўся адкрыты партыйны сход факультэта з парадкам дня «Аб стане і мерах па паляпшэнню работы камсамольскай арганізацыі факультэта ў святле рашэнняў XXVI з'езда КПСС і XIX з'езда ВЛКСМ», на якім зроблены ўсебаковы аналіз работы камітэта камсамола ФПМ, разгледжаны вузлавыя пытанні ўдасканалення стылю партыйнага кіраўніцтва камсамольскай арганізацыяй.

Студэнцкія гады — гэта адказная пара сталення, калі чалавек фарміруецца як грамадзянін. Вось чаму сёння такую актуальнасць мае ленінскі запавет — вучыцца. І не толькі авалодваць ведамі. Вучыцца сумленнай працы, арганізаванасці, працоўнай і маральнай дысцыпліне, уменню цаніць свой і чужы час, неабыякавасці да спраў групы, факультэта. Мы не маем права забываць ленінскі заклік—заклік да таго, каб працэс вучобы ішоў побач з працэсам выхавання.

Поспех гэтай усебаковай вучобы ў немалой ступені вызначаецца баявітасцю камітэта камсамола, камсамольскіх бюро груп і кафедраў, узроўнем падрыхтоўкі, актыўнасцю, палітычнай і маральнай сталасцю іх важакоў. У цэлым можна канстатаваць, што стыль работы камітэта камсамола, камсамольскіх бюро кафедраў ФПМ у апошні час змяніўся ў лепшы бок, што тлумачыцца той увагай, якая ўдзяляецца партыйным бюро факультэта пытанням падбору, расстаноўкі і выхавання камсамольскіх актывістаў. Акрамя таго, улічваючы малую колькасць камуністаў-студэнтаў (8 чалавек), партбюро ФПМ даручыла асноўныя пытанні работы з камсамолам камуністам-выкладчыкам: працоўнае выхаванне—М. М. Трушу, ідэйна-маральнае і прававое — У. А. Жагору, работу ў інтэрнатах — Ю. С. Харыну, грамадска-палітычную практыку — У. В. Бабкову, ваенна-патрыятычнае выхаванне — С. В. Новікаву.

Важнай справай партыйнай арганізацыі з'яўляецца паляпшэнне работы камсамольскіх бюро кафедраў. Безумоўна, размова пойдзе не пра падмену работы, а пра тое, каб узмацніць ролю камсамольскага бюро ў пытаннях паляпшэння дысцыпліны і арганізаванасці, наведвання і паспяховасці, іншых аспектаў работы. Загадчыкі кафедраў, старшыя куратары прысутнічаюць на кафедральных камсамольскіх сходах, у сваіх выступленнях ставяць канкрэтныя, надзённыя пытанні перад камсамольскім бюро. У гэтым годзе камуністу з 50-гадовым партыйным стажам Аляксандру Васільевічу Ераксіну партыйнае бюро даручыла курыраваць работу буйнейшай кафедральнай камсамольскай арганізацыі — кафедры матэматычнага забеспячэння ЭВМ. Вынікі намаганняў Аляксандра Васільевіча бачны ўжо зараз: значна палепшыліся аргработа, ідэйна-палітычнае выхаванне.

Месца жыхарства — месца выхавання. Такое патрабаванне партыі. Такую лінію праводзяць партыйнае бюро, камітэт камсамола, прафсаюзнае бюро факультэта і студсавет інтэрната № 6 у сваёй паўсядзённай рабоце. Кожны месяц партыйнае бюро факультэта зацвярджае план работы ўсіх грамадскіх арганізацый, у тым ліку планы правядзення выхадных дзён. Каардынацыяй гэтых пытанняў займаюцца член партбюро Ю. С. Харын і член камітэта камсамола камуніст У. М. Гайдыш.

Добра папрацавалі восенню мінулага года сельскагаспадарчыя атрады ФПМ на палях Шклоўшчыны: зводны ССГА факультэта заняў першае месца ва універсітэце. У немалой ступені гэты поспех тлумачыцца і той увагай, якая ўдзяляецца партыйным бюро пытанню падбору камандзіраў ССГА. Кіраўніцтва зводным ССГА факультэта было даручана намесніку сакратара партбюро У. В. Малышка.

Роля камітэта камсамола, яго акадэмічнага сектара, савета выдатнікаў, ВВК заключаецца ў тым, каб «навучыць вучыцца», і асабліва студэнтаў малодшых курсаў. Гаворка ідзе пра тое, каб куратары кафедраў і камсамольскія бюро займалі непрымірымую пазіцыю да тых, хто прапускае заняткі без уважлівых прычын, да двоечнікаў. Патрабуе паляпшэння прапаганда вопыту работы лепшых камсамольскіх груп. Павышэнне эфектыўнасці сацыялістычнага спаборніцтва паміж групамі — важная задача камітэта камсамола. Камітэту камсамола, камсамольскім бюро кафедраў, груп разам з куратарамі трэба заўсёды клапаціцца аб умацаванні калектываў студэнцкіх груп, падтрымліваць у іх атмасферу патрабавальнасці, даверу, дружбы.

«Размова ідзе аб тым, — адзначалася на XXVI з'ездзе КПСС, — каб у кожнай камсамольскай арганізацыі была створана жывая, творчая атмасфера». У гэтай ёмкай формуле выражана галоўная задача, якая стаіць і перад камітэтам камсамола, і перад партбюро: камсамольскае жыццё факультэта павінна быць насычана палітычна, напоўнена грамадска карыснымі справамі, цікавымі для кожнага маладога чалавека. Камсамольская арганізацыя факультэта пад кіраўніцтвам партыйнага бюро настойліва і мэтанакіравана працуе над выкананнем гэтай задачы.

**М. ФЕДЗЯНЯ,**
**сакратар партыйнага бюро факультэта прыкладной матэматыкі.**

---

## ЧЫТАЧ ПРАЦЯГВАЕ РАЗМОВУ

# ПЕРАКАНАНАСЦЬ ДАКАЗВАЮЦЬ СПРАВАЙ



ТВАЯ АКТЫЎНАЯ ЖЫЦЦЁВАЯ ПАЗІЦЫЯ... Вымаўляючы гэтую фразу, мы звычайна робім націск на слове **актыўная**. Мне заўсёды хочацца выдзеліць іншае — **жыццёвая**. Папершае таму, што жыццёвая — значыць такая, якая адпавядае патрабаванням самога жыцця. Жыцця грамадства, членамі якога мы з'яўляемся. Патрабуе яно ад чалавека нямала: цвёрдых перакананняў і ўмення адстойваць іх, разумення свайго дачынення да спраў калектыву і, самае галоўнае, здольнасці дзейнічаць, працаваць, жыць у адпаведнасці з гэтымі перакананнямі. Слова не павінна разыходзіцца са справай, справа — са словам, а разам яны заклікаюць служыць аднаму — імкненню зрабіць жыццё акружаючых і сваё ўласнае больш змястоўным, цікавым, яркім, шчаслівым.

Сёння нам па дваццаць. І ад таго, якую пазіцыю зоймем мы ў жыцці грамадства, у многім залежыць, якім яму быць у будучым. Сёння нам па дваццаць, але адкуль часам бярэцца гэтая інфантыльнасць, чаму актыўную жыццёвую пазіцыю некаторыя замяняюць на парасткі мяшчанскага існавання?

У студэнта яны могуць праявіцца з першых дзён знаходжання у ВНУ, іншы раз — пазней. Сімптомы гэтага небяспечнага «захворвання» розныя. Часцей за ўсё паяўляецца нежаданне рабіць штосьці, акрамя прамых абавязкаў студэнта (інакш адлічыць могуць — непрыемна). А як перашкаджаюць нам тыя, хто не верыць ні ў што, хто крытыканствуе, не маючы маральнага права на крытыку, — пачынаючыя мяшчане.

Бывае, што ўсё ўжо разлічана да першага ўступнага экзамена: інстытут выбіраецца па прынцыпу абы было лягчэй—паступіць, вучыцца, скончыць; ці адзіным крытэрыем выбару спецыяльнасці з'яўляецца ступень яе «прэстыжнасці». І, вядома, калі ў ахвяру голаму практыцызму прыносяцца свае думкі і імкненні, часу на тых, з кім вучышся і працуеш, не застаецца, не да актыўнасці такім людзям.

На мой погляд, актыўная жыццёвая пазіцыя студэнта павінна сёння ў першую чаргу, праяўляцца як удзел у грамадскай рабоце, камсамольскім жыцці, а вось формы гэтага ўдзелу могуць быць самымі разнастайнымі.

Пачнём з адносін да вучобы. Паверце, непрыемна чуць вядомую фразу, якая вымаўляецца і добрымі, і далёка не бліскучымі ў сэнсе паспяховасці студэнтамі: «Вучоба — мая асабістая справа, пры чым тут ВВК і камсамол?» А мы, аматары паўтараць, што вучоба — асноўнае камсамольскае даручэнне, не тлумачым не толькі іншым, але і сабе, чаму так на самай справе. Трэба памятаць, што дзяржава выдаткоўвае на нашу прафесійную падрыхтоўку, вучобу і выхаванне сродкі, якія павінны даваць адпаведную аддачу. І наш абавязак, камсамольцаў і студэнтаў БДУ,—выдатна вучыцца. Вось у гэтым сэнсе нельга аддзяляць вучобу ад грамадскай актыўнасці. Добрае пацвярджэнне гэтаму — прыклад нашых лепшых актывістаў, якіх цяжка ўявіць сабе пасрэдна паспяваючымі.

Сваю перакананасць трэба пастаянна даказваць справай. Я ўспамінаю камуністычныя будатрады універсітэта, якія працавалі мінулым летам. Я быў камандзірам аднаго з іх — атрада імя Герояў цаліны і больш за ўсё запомніў зацікаўленасць рабят у сваёй справе. Атрад працаваў на будаўніцтве сярэдняй школы № 154 у г. Мінску. Папрацавалі добра. Налічаны атраду заробак, які мы перадалі ў Савецкі фонд міру, у паўтара раза перавышае сярэдні сярод атрадаў у горадзе. Мы разумеем, наколькі сучасныя, патрэбныя такія будатрады, якія сцвярджаюць сумленныя адносіны да працы. Там, дзе такія адносіны вызначаюцца жыццёвай пазіцыяй самога чалавека, не можа быць ніякай размовы аб парушэннях працоўнай дысцыпліны (у нашым атрадзе не было ніводнага прагула), а добрасумленная праца прыносіць задавальненне і радасць.

Актыўная жыццёвая пазіцыя — гэта назаўсёды; выпрацоўваецца яна гадамі, і вельмі важна ніколі не здраджваць ёй, да канца заставацца прынцыповым, сумленным у адносінах да іншых і да сябе. Імена гэта патрабавальнасць у спалучэнні з непахіснай перакананасцю, якая пацвярджаецца справамі, усім жыццём, і вызначае, на мой погляд, актыўную жыццёвую пазіцыю нашага сучасніка.

**Ю. ВАРАТНІЦКІ,**
**студэнт факультэта радыёфізікі і электронікі.**

---

# НАША КНІГА

**«Кніга — гэта сябар, дарадчык. Гэта—крыніца многіх добрых думак, пачуццяў, ведаў. І часам цяжка вызначыць, якую кнігу і за што любіш болей».**

Словы гэтыя належаць першаму ў свеце лётчыку-касманаўту Ю. А. Гагарыну, чалавеку, які па-сапраўднаму любіў і паважаў кнігу.

У СССР штодзённа выходзіць звыш 4640 тысяч экземпляраў кніг на 145 мовах, у тым ліку на 89 мовах народаў краіны. І што адметна, на 43 мовах народнасцей, якія атрымалі ўласную пісьменнасць толькі пасля Вялікага Кастрычніка.

...У аддзеле рэдкай і каштоўнай кнігі БДУ імя У. І. Леніна побач са старажытнымі фаліянтамі ў скураных пераплётах, з залатым цісненнем, з пакручастай вяззю шрыфтоў і малюнкаў ганаровае месца займаюць кнігі, датаваныя першымі гадамі новай эпохі — эпохі рэвалюцыйнага абнаўлення свету. Непрыкметныя, без знешняй стракатасці і кідкасці, яны, тым не менш, нясуць у сабе магутны зарад перадавой чалавечай думкі, утрымліваюць гарачае дыханне велічных дзён нараджэння Краіны Саветаў. Вось першы том артыкулаў У. І. Леніна «За 12 год», выдадзены Петраградскім Саветам рабочых і сялянскіх дэпутатаў у 1918 годзе. А побач — «Камуністычны маніфест» К. Маркса і Ф. Энгельса, «Заработная плата, цана і прыбытак» К. Маркса, «Філасофія. Палітычная эканомія. Сацыялізм» Ф. Энгельса. Дарэчы, апошняя выдадзена кааператыўным выдавецтвам «Гомельскі рабочы».

Задыхаючыся ў агні імперыялістычнай інтэрвенцыі, змагаючыся з холадам і голадам, Савецкая Расія ні на хвіліну не сумнявалася: мы пераможам. І нараджаліся новыя людзі, новыя словы, новыя паняцці. Новыя кнігі таксама. Факт: не маючы дастаткова моцнай паліграфічнай базы, мы друкавалі кнігі за мяжой. Так «нарадзіліся» ў Берліне «Паходжанні Чычыкава, ці мёртвыя душы» Гогаля...

Сёння, у самай чытаючай краіне свету, можна толькі са здзіўленнем думаць аб гэтым: хіба магло быць такое? Было! Бо нават у час самых цяжкіх выпрабаванняў любоў да кнігі не пахіснулася ў народзе. І як сведчанне таму — поўны збор твораў І. С. Нікіціна, М. Я. Салтыкова-Шчадрына, А. В. Кальцова, В. А. Жукоўскага, выдадзеныя ў трывожным 1918 годзе, калі Украіна і частка Беларусі былі акупіраваны войскамі Кайзера, а на Каўказе, у Адэсе, у Крыму і Уладзівастоку высадзіліся англійскія, японскія, французскія і іншыя інтэрвенты.

Савецкая ўлада дапамагла распасцерці крылы літаратурным сілам нацыянальных ускраін Расіі. Паявіліся свае друкарні на Украіне, у Беларусі, у Закаўказскіх рэспубліках. Безумоўную цікавасць выклічуць у наведвальнікаў аддзела кнігі вершаў Янкі Купалы «Шляхам жыцця» (1923 г.), «Безназоўнае» (1925 г.), паэма Якуба Коласа «Новая зямля» з аўтографам брата паэта Іосіфа Міцкевіча, «Вершы, байкі, эпіграмы, паэмы» Кандрата Крапівы...

Наша кніга... Цяжка сказаць, калі мы не звяртаемся да яе. Яна прыходзіць да нас у дзяцінстве і суправаджае па жыцці, ёй мы давяраем свае думкі, мары, надзею і веру, ёй абавязаны ўсім добрым у сабе.

**А. ГОЛУБЕВА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

# САМАЯ НАПРУЖАНАЯ ПАРА

## ІНТЭРВ'Ю З ВЫДАТНІКАМ

**«НАПРУЖАНАЯ ПАРА», «гарачы час», як толькі ні называюць сесію. І маюць рацыю. Асабліва ў дачыненні да першакурснікаў. Для іх яна—і бяссонныя ночы перад экзаменам, і ўсхваляваныя адказы на пытанні экзаменацыйнага білета, і першыя адзнакі ў залікоўцы. І ад таго, добрыя яны ці не вельмі, у многім залежыць далейшы рост студэнта, бо, як кажуць, добраму пачатку — добры канец. Думаю, што кожнаму студэнту універсітэта не абыякава наконт гэтага думка студэнта-выдатніка фізічнага факультэта Валерыя СМАЛЬЦАРА.**

**— Валерый, я ведаю, што ты закончыў школу з залатым медалём. Перад табой былі магчымасці паступлення ў любую ВНУ. Але ты ўсё ж вырашыў, што тваё сапраўднае прызванне — фізіка.**

— Выбар мой быў далёка не выпадковым. Пасля заканчэння васьмі класаў я паступіў у завочную фізіка-матэматычную школу пры БДУ імя У. І. Леніна. За паспяховую вучобу і высокія вынікі, паказаныя на гарадскіх, абласных алімпіядах, мне далі пуцёўку ў «Зубронак». Там, сустракаючыся з многімі выкладчыкамі БДУ, я ўпершыню падрабязна даведаўся пра фізічны факультэт. І, мабыць, у гэты час я ўсвядоміў, што фізіка — гэта не проста захапленне, гэта мая мэта, да якой я павінен імкнуцца.

**— Як ты думаеш, чаму не ўсе школьнікі-медалісты, паступіўшы ў інстытут ці універсітэт, займаюцца не вельмі паспяхова?**

— На мой погляд, існуе нямала прычын. Назаву некаторыя з іх. Па-першае, гэта недастатковая падрыхтоўка да засваення такога матэрыялу, які даецца ў ВНУ, адсутнасць навыкаў у канспектаванні лекцый, няўменне хутка прывыкнуць да рытму студэнцкага жыцця. Па-другое, асобныя юнакі і дзяўчаты удзяляюць вельмі многа часу на вывучэнне любімага прадмета, не спыняючы ўвагі на іншых. І нарэшце, не ўсе вучацца ў меру сваіх сіл і пасля не зусім паспяховых вынікаў першай сесіі губляюць веру ў свае магчымасці.

**— Ёсць такі студэнцкі афарызм: «Сесія — гэта латарэя». Твае адносіны да яго?**

— Я лічу гэта не зусім правільным. З аднаго боку, зыход гэтага працяглага «паядынку студэнта з выкладчыкам» залежыць ад назапашаных ведаў у час падрыхтоўкі, ад умення дакладна і паслядоўна выказваць свае думкі.

А з другога боку, экзамену сапраўды ўласцівы элементы выпадковасці. І з даўніх часоў мара кожнага студэнта — выцягнуць шчаслівы білет. Але ў канчатковым выніку, які б білет ён ні выцягнуў, выкладчык здолее ацаніць узровень яго ведаў — для гэтага і існуюць дадатковыя пытанні.

**— А ці кожны здолее займацца на выдатна?**

— Для гэтага мала аднаго жадання. Патрэбны здольнасці, якія павінны спалучацца з настойлівай працай.

**— Ты жывеш у інтэрнаце. Умовы для вучобы не самыя спрыяльныя. І ўсё ж у цябе няма ніводнай чацвёркі за чатыры гады...**

— Калі ёсць мэта, то дабіцца поспеху можна ў любых абставінах. На асабістым вопыце я пераканаўся, што ўмовы ў інтэрнаце далёка не самыя горшыя. А пастаянная сувязь з таварышамі нават садзейнічае развіццю магчымасцей.

**— Праз паўтара года ты развітаешся з БДУ. За гэты час назапашаны пэўны багаж ведаў і вопыту. У самы адказны час для першакурснікаў і для ўсіх студэнтаў—у перыяд сесіі—што ты хацеў бы пажадаць ім!**

— Не трэба думаць, што сесія — нешта вельмі непрыемнае ў жыцці студэнта. Наадварот, гэта адна з самых яркіх старонак. Яна дае магчымасць кожнаму студэнту паказаць, на што ён здольны. Сесію можна параўнаць са спартыўным спаборніцтвам. Выйграць ці прайграць? І я жадаю ўсім толькі перамог. І калі ўсё ж чакае цябе няўдача, не адчайвайся, яна будзе часовай. Толькі ўмей запаліць і захаваць у сабе гэты спартыўны інтарэс.

**А. САЗАНОВІЧ,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**



*СПЕЦЫЯЛЬНАЕ канструктарска-тэхналагічнае бюро з доследнай вытворчасцю (СКТБ) БДУ імя У. І. Леніна —складанае і вельмі неабходнае прадпрыемства. Тут задумы вучоныхператвараюцца ў сучасныя прылады. Пра інжынераў, канструктараў і рабочых, якія працуюць пад кіраўніцтвам Мікалая Іванавіча Акімава, гавораць: «Залатыя рукі ў іх!» І не дзіўна, таму што калектыў СКТБ выйшаў пераможцам юбілейнага Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва сярод адпаведных прадпрыемстваў краіны. Пераходны Чырвоны сцяг Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі і галіновага прафсаюза — дастойная ўзнагарода за дасягнутыя поспехі, за добрасумленную працу.*

*НА ЗДЫМКАХ: лінія зборкі пячатных плат; малады рабочы доследнай вытворчасці камсамолец Генадзь Гармаза. Ён—токар-фрэзероўшчык 4-га разраду.*

*Фота В. ШАЧАКА.*



# Песня—душа народа

## ФАЛЬКЛОРНАЯ ПРАКТЫКА

ЧАТЫРЫ ГРУПЫ першакурснікаў беларускага аддзялення філалагічнага факультэта праходзілі фальклорную практыку ў Любанскім і Старадарожскім раёнах. Наша група працавала ў вёсцы Залужжа. Вось зроблены першыя практычныя крокі збіральніка. Паявілася пачуццё ўпэўненасці, а потым — задавальнення і нават асалоды ад знаёмства з людзьмі, ад фальклорных дыяментаў, якія адшукалі за дзень.

Пагартаем дзённік:

«7 ліпеня. Пазнаёміліся з вельмі цікавым чалавекам — Лідзіяй Кузьмінічнай Туравай. Яна мае мяккі, прыемны голас, спявае пранікнёна і адухоўлена. Запісалі ад яе шмат песень, шэраг павер'яў, гаданні дзяўчат у навагоднюю ноч».

«9 ліпеня. Надзея Пятроўна Кадушкіна многа цікавага расказала аб вясельным абрадзе вёскі Залужжа, пра песні, прыпеўкі да танцаў, пажаданні маладым. Шмат чаго мы пачулі і пра прыкметы аб надвор'і».

«10 ліпеня. Выязджалі ў вёску Сінячова. Завітаўшы ў некалькі хат, натрапілі на Марыю Пятроўну Зубарэвіч, якая пераказала нам звыш 20 тэкстаў народных песень».

«18 ліпеня. Перапісвалі ў сшытак творы з магнітафоннай стужкі, сістэматызавалі і афармлялі тэксты. Пісалі справаздачу аб праходжанні практыкі».

Так праходзілі нашы працоўныя будні. Але практыка стала для нас і школай чалавечнасці. Мы сустракаліся, размаўлялі з людзьмі самых розных лёсаў.

А з якім задавальненнем слухалі студэнты сакавітую і каларытную мясцовую гаворку. Мова многіх калгаснікаў проста перасыпана прыказкамі, прымаўкамі, выслоўямі і трапнымі параўнаннямі.

Хочацца адзначыць вялікую, станоўчую ролю практыкі для нас як будучых філолагаў. Адна справа — чуць аб фальклорных багаццях нашага народа на лекцыях і зусім іншая — чэрпаць іх з першакрыніц.

Калі мы пакідалі вёску, намі авалодаў сум, бо паспелі прывыкнуць да жыхароў Залужжа і шкадавалі, што ўсё ж мала паспелі зрабіць. З цягам часу выканаўцы забываюць творы. Знікаюць скарбы нашага народа, і адным філолагам не пад сілу выправіць становішча. У сувязі з гэтым хачу звярнуцца за дапамогай да студэнтаў, якія ў час канікулаў будуць у вёсцы. Тыя, каму не абыякавы лёс фальклорных багаццяў, могуць аказаць неацэнную дапамогу, запісваючы вусную народную творчасць. За парадамі і метадычнымі рэкамендацыямі можна звяртацца на кафедру беларускай літаратуры філалагічнага факультэта.

Хочацца, каб кожны з нас памятаў словы Ніла Гілевіча пра шэдэўры беларускага фальклору: «У іх словах і мелодыях такая вялікая паэзія Любві і Пяшчоты, перад якою культурны чалавек не можа не схіліцца. А схіліўшыся — адчуе сябе і прыгажэйшым, і шчаслівейшым, чым быў дагэтуль.

Дык вазьміце ж з сабою песні роднага краю!

Вазьміце на ўвесь век — на шчасце!»

**У. СІЎЧЫКАЎ,**
**студэнт II курса філалагічнага факультэта.**

## ПАТРАБУЕ ВЫРАШЭННЯ

З ІГАРАМ МІКЛАШЭВІЧАМ, адказным за інтэрработу на фізічным факультэце, мы сустрэліся ў камітэце камсамола. Падставы для размовы былі: фізфак плённа развівае супрацоўніцтва са школьнікамі. Менавіта гэта мяне больш за ўсё і цікавіла.

— Што вы плануеце на гэты навучальны год?

— Задумак многа. Мяркуем з дапамогай студэнтаў з ГДР зрабіць гадавы цыкл лекцый аб іх краіне з адначасовай дэманстрацыяй слайд-фільмаў. Таксама плануем арганізаваць у школе вечар «Развіццё танцаў на Кубе». Перад школьнікамі выступіць агітбрыгада кубінскіх студэнтаў. У кафэ «Гаўдэамус» збіраемся правесці вечар, прысвечаны гадавіне кубінскай рэвалюцыі.

# ДАГАВОР ЗАКЛЮЧАН. ШТО ЗА ІМ?

— Мінулай вясной, — гаворыць Ігар, — мы заключылі дагавор па інтэррабоце паміж камітэтамі камсамола фізфака і школы № 76. Мэта яго: актывізаваць інтэрработу ў сябе на факультэце і ў школе, каб выпускнікі мелі больш яскравае ўяўленне аб жыцці іншых краін. З другога боку, замежныя навучэнцы таксама змогуць бліжэй пазнаёміцца з жыццём савецкіх школьнікаў.

— Апраўдаў сябе дагавор?

— Безумоўна. У школе выступалі студэнты з ГДР, якія расказалі аб сваёй радзіме. Была праведзена лекцыя па творчасці вядомага іспанскага паэта Федэрыка Гарсія Лоркі. Нядаўна адбылася экскурсія ў Мір і Нясвіж. Ездзілі з намі і школьнікі. Прычым для іх гэта паездка была ў якасці ўзнагароды: паехалі тыя, хто прымаў актыўны ўдзел у конкурсе палітэрудытаў.

Вялікую дапамогу аказваюць замежныя студэнты. Напрыклад, лекцыі, у якіх студэнты з розных частак свету расказваюць аб сваіх краінах, пачалі праводзіцца па ініцыятыве старшыні савета дружбы факультэта Глеске Хольгера.

Але на самай справе не ўсё ідзе так гладка, як аб гэтым расказвае Ігар Міклашэвіч.

Лена **Паўлюкевіч**, сакратар камітэта камсамола 76-й школы:

— Пра дагавор амаль нічога не ведаю. Хаця нашы хлопцы хадзілі на нейкі вечар да вас у кафэ. Удзельнічалі і ў экскурсіі, але не нашы вучні, якія перамаглі ў конкурсе палітэрудытаў, а пераможцы мінулага года, якія цяпер вучацца ў розных установах. Болей жа нічога не праводзілася.

Нэла Уладзіміраўна **Лабанава**, дырэктар школы:

— Аб гэтым дагаворы маю вельмі цьмянае ўяўленне. Пагаварыце лепш з нашым арганізатарам Валянцінай Іванаўнай.

**В. І. Мамко:**

— Так, ездзілі нашы выпускнікі ў Мір і Нясвіж. Хадзілі некаторыя рабяты і ў кафэ. Больш нічога не праводзілася.

Дык як жа так атрымалася, што такая цікавая і карысная справа рознымі бакамі трактуецца па рознаму? Пачынанне добрае, а вынікаў няма.

Між іншым, 76-я школа па выніках інтэрработы заняла першае месца сярод школ горада. Выходзіць, калі ўзяць паасобку, фізфак працуе добра, школьнікі таксама нядрэнна, а сапраўднага супрацоўніцтва паміж імі няма.

Навучальны год у самым разгары, дагавор у сіле, камітэтам камсамола ёсць час і магчымасці, каб наладзіць справу.

**С. ПЛЫТКЕВІЧ,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

СЛОВА — ЗАМЕЖНАМУ СТУДЭНТУ

# СВЯТА ЎСІХ НАРОДАЎ

НЯДАЎНА савецкія людзі адзначылі знамянальнае свята — 60-годдзе ўтварэння СССР. Гэта свята незвычайнае тым, што разам з савецкім народам яго адзначае ўсё прагрэсіўнае чалавецтва, тым, што ўтварэнне Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік з'явілася не толькі значным крокам ва ўмацаванні і развіцці ідэй сацыялізму, але і стала сімвалам для тых нацый і народнасцей усяго свету, якія марылі аб новым жыцці, якое асноўваецца на роўнасці і павазе кожнага чалавека, незалежна ад яго становішча ў грамадстве, на веры ў прагрэс чалавецтва.



Мы, члены зямляцтва аспірантаў і студэнтаў з Алжыра, якія вучацца ва універсітэце, з вялікім задавальненнем прымалі ўдзел у мерапрыемствах, прысвечаных гэтай знамянальнай даце.

Зямляцтва пры актыўным удзеле і дапамозе куратараў У. Г. Будая і Н. П. Густоўскай правяло ўрачысты вечар, прысвечаны 65-й гадавіне Вялікага Кастрычніка — важнейшай падзеі нашай эпохі, якая зрабіла магчымым утварэнне СССР. Прадстаўнікі нашай краіны, а таксама Гвінеі, Іярданіі, якія выступілі на сходзе, гаварылі аб тым, якое ўздзеянне аказваюць ідэі У. І. Леніна, ідэі Кастрычніка.

Цікава прайшла сустрэча членаў зямляцтва з вучнямі старэйшых класаў СШ № 60 г. Мінска. Нам было вельмі прыемна расказваць пра поспехі будаўніцтва сацыялізму ў Алжыры, пра дапамогу, якую аказвае Савецкі Саюз нашаму народу ў барацьбе за новае жыццё.

18 снежня 1982 года мы ўдзельнічалі ва Усесаюзным камуністычным суботніку. Калі мы даведаліся, што будзем працаваць на будаўніцтве станцыі метро «Плошча У. І. Леніна», усе вельмі узрадаваліся, што зможам удзельнічаць у камсамольскай ударнай будоўлі Беларусі, ды яшчэ на станцыі, якая будзе насіць імя У. І. Леніна. І хай нам не даверылі работу на сур'ёзнай тэхніцы, але энтузіязму ў нас ад гэтага не паменшылася.

Заключэннем праведзеных зямляцтвам мерапрыемстваў стаў тэматычны вечар «Утварэнне СССР — трыумф ленінскай нацыянальнай палітыкі», які адбыўся ў інтэрнаце № 2. З дакладам на гэту тэму выступіў



студэнт IV курса аддзялення палітэканоміі гістарычнага факультэта Х. Берафа. Ён падкрэсліў велізарнае міжнароднае значэнне ўтварэння СССР для ліквідацыі ў свеце расізму, апартэіду і іншых форм нацыянальнага гнёту.

**АЛІ РАФЕС (Алжыр), аспірант, член інтэрпрэс-цэнтра.**

**НА ЗДЫМКАХ: удзельнікі тэматычнага вечара знаёмяцца з матэрыяламі, якія расказваюць пра гісторыю утварэння СССР; добры настрой у Алі Рафеса перад суботнікам!**

Фота У. Будая.

# Важнае звяно работы

**На ўсіх факультэтах універсітэта па распараджэнню рэктарата праведзена праверка сістэмы кантролю за якасцю работы. Рэдакцыя газеты звярнулася да загадчыка кафедры крымінальнага права прафесара І. С. ЦІШКЕВІЧА з просьбай расказаць, як арганізаваны кантроль на данай кафедры. Па гэтым можна ў пэўнай меры меркаваць аб стане кантролю ў цэлым на юрыдычным факультэце.**

Мерапрыемствы па ажыццяўленню кантролю за якасцю вучэбна-выхаваўчага працэсу на кафедры крымінальнага права, як і на астатніх шасці кафедрах юрыдычнага факультэта, плануюцца на пяцігодку і на кожны навучальны год. Планы складаюцца па формах, рэкамендаваных вучэбным аддзелам і рэктаратам універсітэта і носяць канкрэтны характар. У іх указваецца, у якім аб'ёме і калі будзе правярацца работа кожнага выкладчыка. Пры гэтым у адносінах да выкладчыкаў, якія перавыбіраюцца на новы пяцігадовы тэрмін на тую ж пасаду ці выбіраюцца на больш высокую (ст. выкладчыка, в. а. дацэнта), правяраецца ўся іх вучэбная, метадычная, навуковая і выхаваўчая работа за справаздачны перыяд, у адносінах да астатніх членаў кафедры — іх работа па 3—4 асобных напрамках.

Калі правяраецца якасць усёй работы выкладчыка, назначаецца камісія ў саставе трох чалавек пад старшынствам выкладчыка той жа ці больш высокай кваліфікацыі. Правяраемы ў гэтым выпадку чытае адкрытую лекцыю, на якой абавязкова прысутнічаюць члены камісіі. Калі правяраецца работа выкладчыка, які не чытае лекцыйнага курса, праводзяцца адкрытыя семінарскія ці практычныя заняткі.

Комплексныя праверкі работы выкладчыкаў праводзяцца па распрацаванай кафедрай праграме. Камісія складае акт праверкі і пры абмеркаванні справаздачы правяраемага на пасяджэнні кафедры аб рабоце за адпаведны перыяд дае сваё заключэнне аб якасці гэтай работы і прапануе праект рашэння кафедры аб тым, заслугоўвае ці не гэты выкладчык выбрання ці перавыбрання на пасаду або прадстаўлення да вучонага звання.

На кафедры практыкуецца ўзаеманаведванне лекцый, семінарскіх і практычных заняткаў, экзаменаў і залікаў. Уражанні ад такіх наведванняў фіксіруюцца у «Сшытку кантролю наведвання і ўзаеманаведвання лекцый, семінарскіх і практычных заняткаў». У ім адлюстроўваюцца таксама вынікі праверкі якасці рэцэнзіравання кантрольных работ студэнтаў-завочнікаў. Указваюцца як станоўчыя моманты, так і недахопы.

Два-тры разы на працягу навучальнага года на пасяджэннях кафедры абмяркоўваўся ход выканання індывідуальных планаў работы выкладчыкаў. У абавязковым парадку гэта рабілася па выніках работы за першы семестр і пры падвядзенні вынікаў за ўвесь навучальны год.

Па ўказанню дэканата на пасяджэннях кафедры пастаянна абмяркоўваюцца пытанні аб ходзе падрыхтоўкі да зімовай і летняй экзаменацыйных сесій і дзяржаўных экзаменаў, а таксама вынікі сесій і дзяржаўных экзаменаў і абароны дыпломных работ.

Распрацавана і размножана на ратапрынце «Метадычнае пісьмо па падрыхтоўцы студэнтамі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна дыпломных работ па крымінальнаму праву, крыміналогіі і папраўча-працоўнаму праву», якое не толькі аказвае дапамогу студэнтам у павышэнні якасці гэтых работ, але і дапамагае ў кантролі за выкананнем адпаведных патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да дыпломнага праекта.

Прафесарска-выкладчыцкі састаў кафедры вядзе для сябе ўлік наведвання лекцый, семінарскіх і практычных заняткаў і бягучай паспяховасці студэнтаў. Студэнты, якія прапускаюць заняткі, выклікаюцца на абавязковыя кансультацыі для здачы залікаў па адпаведнай тэме. За два месяцы перад экзаменацыйнай сесіяй на кожных занятках адводзіцца па 15—20 мінут для праверкі ведаў студэнтаў па найбольш складаных тэмах, што вывучаліся раней.

Якасць самастойнай работы студэнтаў, яе вынікі адлюстроўваюцца ў спецыяльным «Экране бягучай паспяховасці».

Для павышэння якасці дысертацый, манаграфій, вучэбнікаў і вучэбных дапаможнікаў, якія рыхтуюцца членамі кафедры, яны папярэдне абмяркоўваюцца на пасяджэнні кафедры.

На кафедры добра працуе створанае некалькі гадоў назад вучэбна-метадычнае звяно, якое ўзначальвае вопытны выкладчык кафедры кандыдат юрыдычных навук дацэнт А. У. Баркоў. Вытворча-метадычнае звяно працуе па плану, зацверджанаму на пасяджэнні кафедры, і кантралюе работу студэнтаў па падрыхтоўцы курсавых і дыпломных работ і інш.

Але ў арганізацыі кантролю за работай выкладчыкаў і студэнтаў ёсць і значныя недахопы. Не заўсёды своечасова вядзецца справаздачная дакументацыя аб правядзенні вучэбных заняткаў, часам са спазненнем запаўняецца «Экран бягучай паспяховасці», некаторыя выкладчыкі рэдка наведваюць лекцыі сваіх калег, усё яшчэ дрэнна кантралюецца і накіроўваецца работа па ўкараненню тэхнічных сродкаў навучання.

БУМЕРАНГ

# Пазіцыя ці амбіцыя?

ШЧЫРА КАЖУЧЫ, выступаць адразу пасля Новага года Ліхтарык не збіраўся. Аднак абставіны прымусілі яго ўзяцца за пяро.

Віншаванні, як вядома, прымаюць перад святам. А вось у тым, што ўсім вам давялося атрымаць святочныя паштоўкі ў тэрмін, Ліхтарык зусім не ўпэўнены.

Памятаеце, у адным з вясенніх нумароў «Беларускі універсітэт» звяртаўся ў фельетоне «На вёску, дзядулю» да работнікаў аддзялення сувязі, якое абслугоўвае універсітэцкія інтэрнаты. Вы думаеце, з той пары што-небудзь змянілася?

Праверка, праведзеная нядаўна членамі штаба «КП», паказала, што становішча застаецца дрэнным. Мноства пісьмаў дастаўляецца не па адрасу. І больш за ўсё здзіўляе ў гэтай справе пазіцыя, занятая работнікамі паштовага ведамства. У адказе штабу «КП», падпісаным начальнікам вузла ГСП Мінскага паштамта, віна за няправільную дастаўку пошты ўскладаецца на... адрасатаў (!). Маўляў, у тым, што пісьмы, якія яны чакаюць, аказаліся зусім не там, вінаваты самі ж чакаючыя. Вядома, памылкі магчымы ва ўсякай справе. Але калі ў інтэрнат № 7 па вуліцы Кастрычніцкай дастаўляюць пісьмы, накіраваныя на вуліцу Варвашэні, кіраўніцтву ВА «Гарызонт» і нават у другія гарады (!), гаварыць даводзіцца не пра звычайныя памылкі, а пра надзвычайную нядбайнасць. Вось так, паважаныя чытачы, майце на ўвазе, што навагоднія віншаванні, дасланыя вам, могуць спакойненька пыліцца дзесьці ў другім канцы горада. Па вашай жа віне...

ЛІХТАРЫК.



Індустрыяльны пейзаж.

Фотаэцюд В. ШАЧАКА.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

13 студзеня 1983 г.

Зак. 75. АТ 04022

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ